# Юбилеи

# Jubilee

## Сцяпан Фёдаравіч СОКАЛ

## Styapan Fiodaravich SOKAL



8 студзеня 2018 г. свой 75-гадовы юбілей адзначыў Сцяпан Фёдаравіч Сокал – вядомы беларускі вучоны, доктар юрыдычных навук, прафесар, заснавальнік Саюза юрыстаў Беларусі, а таксама Беларускага інстытута правазнаўства – першай недзяржаўнай вышэйшай навучальнай установы ў Рэспубліцы Беларусь, галоўны рэдактар навуковапрактычнага і інфармацыйна-метадычнага часопіса «Сацыяльна-эканамічныя і прававыя даследаванні». Вучоны з'яўляецца адным з заснавальнікаў гісторыі палітычных і прававых вучэнняў Беларусі.

Працоўная і навуковая дзейнасць Сцяпана Фёдаравіча Сокала – прыклад мэтанакіраванасці, працавітасці, высокага прафесіяналізму і нястомнай энергіі. Яго шлях у навуку быў даволі няпростым.

Сцяпан Фёдаравіч нарадзіўся ў Ляхавіцкім раёне Брэсцкай вобласці. У 1959 г. скончыў сярэднюю школу ў г. Баранавічах і паступіў у Гродзенскае музычнае вучылішча. Перавёўшыся на завочнае аддзяленне музвучылішча, працаваў настаўнікам у Ляхавіцкай музычнай школе. Праз некаторы час, па словах Сцяпана Фёдаравіча, ён крыху расчараваўся ў музычнай кар'еры і абраў юрыспрудэнцыю асноўнай сферай дзейнасці[1]. У 1963 г. ён паступае на юрыдычны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта і паралельна завочна заканчвае Брэсцкае музычнае вучылішча.

Пасля завяршэння вучобы ва ўніверсітэце ён быў накіраваны працаваць памочнікам пракурора Чэрыкаўскага раёна Магілёўскай вобласці. Сцяпан Фёдаравіч лічыць гэты этап вельмі карысным для свайго станаўлення як юрыста. Савет юрыдычнага факультэта рэкамендаваў яго як аднаго з лепшых выпускнікоў для паступлення ў завочную аспірантуру Інстытута філасофіі і права Акадэміі навук БССР. Паколькі на любімы напрамак, прыя-

[1] *Загорский Н.* Степан Сокол: «Лишних знаний не бывает» [Электронный ресурс] // Директор. URL: http://director.by/zhurnal/arkhiv-zhurnala/arkhiv-nomerov-2017/379-11-221-noyabr-2017/5640-stepan-sokol-lishnikh-znanij-ne-byvaet (дата обращения: 22.02.2018).

рытэтны для Сцяпана Фёдаравіча, «Гісторыя дзяржавы і права» месцаў не было, ён выбраў гісторыю філасофіі. У лютым 1970 г. яго перавялі на дзённае аддзяленне ў Мінск, а восенню 1971 г. Сцяпан Фёдаравіч скончыў аспірантуру з рэкамендацыяй дысертацыі на суісканне вучонай ступені кандыдата філасофскіх навук да абароны. У сакавіку 1972 г. паспяхова абараніў яе (тэма даследавання – «Сацыялагічная і палітычная думка ў Беларусі ў другой палове XVI ст.»). Пасля заканчэння аспірантуры Сцяпан Фёдаравіч працуе малодшым навуковым супрацоўнікам Інстытута філасофіі і права. Потым маладога вучонага запрашаюць у Мінскі радыётэхнічны інстытут, дзе ён займае пасады старэйшага выкладчыка, дацэнта, выконваючага абавязкі загадчыка кафедры. З інстытута яго пераводзяць у Міністэрства адукацыі БССР на пасаду інспектара Упраўлення выкладання грамадскіх навук. Як кажа Сцяпан Фёдаравіч, праца чыноўніка не вельмі яму падабалася, але стала карысным вопытам у далейшым. Там ён азнаёміўся з арганізацыяй вучэбнага працэсу, прынцыпамі работы вышэйшай школы. Гэты досвед спатрэбіўся пры стварэнні інстытута.

У 1985–1990 гг. Сцяпан Фёдаравіч працаваў дэканам юрыдычнага факультэта Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы. Ён працягвае займацца навукова-даследчай дзейнасцю і ў 1983 г. абараняе доктарскую дысертацыю.

На ўсіх пасадах Сцяпан Фёдаравіч праявіў такія якасці, як актыўнасць, добрасумленнасць, патрабавальнасць да сябе.

У 1990 г. вучоны разам з калегамі арганізаваў Саюз юрыстаў БССР і стаў яго старшынёй. Ён першы ў суверэннай Беларусі рэалізаваўся ў новай адукацыйнай прасторы, заснаваўшы прыватную ўстанову вышэйшай адукацыі – Беларускі інстытут правазнаўства, які за кароткі час заваяваў аўтарытэт не толькі ў нашай краіне, але і за яе межамі.

Юрыдычнае супольніцтва ведае Сцяпана Фёдаравіча як граматнага і таленавітага кіраўніка і арганізатара, навукоўца, высокакваліфікаванага педагога, дзейнасць якога шмат гадоў звязана з беларускай юрыдычнай навукай і падрыхтоўкай спецыялістаў вышэйшай кваліфікацыі, аўтара звыш 160 навуковых работ, у тым ліку шэрагу манаграфій, пад яго кіраўніцтвам абаронена 11 кандыдацкіх дысертацый.

Валодаючы высокім прафесіяналізмам, нястомнай энергіяй, спагадлівасцю, справядлівасцю, Сцяпан Фёдаравіч заслужыў глыбокую пашану і аўтарытэт як сярод супрацоўнікаў інстытута, так і ў юрыдычным асяроддзі Беларусі і замежжа.

Акрамя асноўнай дзейнасці, вучоны выконвае вялікую грамадскую работу як член двух саветаў па абароне дысертацый, заснавальнік і галоўны рэдактар навукова-практычнага і інфармацыйна-метадычнага часопіса «Сацыяльна-эканамічныя і прававыя даследаванні», уключанага Вышэйшай атэстацыйнай камісіяй Рэспублікі Беларусь у Пералік навуковых выданняў для апублікавання вынікаў дысертацыйных даследаванняў па юрыдычных і эканамічных навуках.

Дзейнасць Сцяпана Фёдаравіча як вучонага, педагога, юрыста, грамадскага дзеяча адзначана высокімі ўзнагародамі, сярод якіх ордэн «Знак Пашаны», нагрудныя знакі Міністэрства адукацыі «Выдатнік адукацыі Рэспублікі Беларусь», Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь «За адзнаку» II ступені і «Ганаровы работнік юстыцыі», ганаровыя граматы Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь і Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь.

Калектыў юрыдычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта горача і сардэчна віншуе Сцяпана Фёдаравіча з юбілеем, выказвае шчырыя пачуцці павагі і ўдзячнасці за шматгадовую і плённую працу на ніве юрыдычнай навукі і адукацыі, высокі прафесіяналізм, чалавечыя якасці і жадае моцнага здароўя, шчасця, далейшых поспехаў у працы, дабрабыту, бадзёрага даўгалецця і ўсяго самага добрага.

***С. А. Балашэнка***,
доктар юрыдычных навук, прафесар,
дэкан юрыдычнага факультэта БДУ